**А. В. Катовіч,** *выкладчык кафедры этналогіі і фальклору БДУ культуры і мастацтваў*

# ТЫДЗЕНЬ ЯК ТРАДЫЦЫЙНАЯ АДЗІНКА ВЫМЯРЭННЯ ЧАСУ

Зручнае ў выкарыстанні і звыклае для нашай свядомасці злічэнне часу па тыднях, якія налічваюць па сем дзён, не з'яўляецца славянскай вынаходкай. Гэта адкрыццё вавілонскай цывілізацыі, якое грунтавалася на пэўных астранамічных велічынях. Усход і захад сонца далі людзям самую першую і асноўную меру часу – дзень і ноч (суткі). У тыя часы, калі людзі былі непісьменнымі, яны падлічвалі колькасць пройдзеных дзён зарубкамі на палачках (адсюль прымаўка: "Зарубі сабе на носе") ці вузельчыкамі на спецыяльна прыгатаваных для гэтага вяроўках. Лік дзён і начэй ажыццяўлялі яшчэ пры дапамозе пяці пальцаў на руцэ. Такі тыдзень называлі "пяціднеўкай", або "малым" тыднем. Прамое пацвярджэнне гэтаму можна знайсці і ў нашым штотыднёвым злічэнні часу. Калі ўважліва ўслыхацца ў назвы дзён сучаснага тыдня, то атрымаецца, што яны ўтрымліваюць у сваіх назвах парадкавы лік: аўторак – другі, чацвер – чацвёрты, пятніца – пяты. Пазней дні сталі падлічваць пры дапамозе пальцаў дзвюх рук, што дало магчымасць з'явіцца вядомай нам дэкадзе. Старажытныя рымляне і этрускі адлічвалі час васьміднеўкамі. Яны далі назвы дням па літарах ад А да Н. Сем дзён тыдня былі працоўнымі, а восьмы лічылі днём для правядзення кірмашоў і гандлярства.

Яшчэ раз вернемся да адкрыццяў вавілонян. Самым старажытным календаром, які з'явіўся за некалькі тысячагоддзяў да н.э., быў месячны каляндар. За аснову быў узяты прамежак часу паміж аднолькавымі фазамі месяца – ад першай чвэрці і да наступлення першай чвэрці новага месяца (29,5 сутак). Калі ўлічыць той час, што месяца зусім не бачна з зямлі (доўжыцца каля 1,5 сутак), то працягласць часу паміж фазамі месяца складае 28 сутак. Было заўважана, што кожная фаза цягнецца прыкладна сем сутак. Таму прамежак часу паміж аднолькавымі фазамі месяца, які таксама назвалі месяцам, падзялілі на чатыры часткі – чвэрці, кожная з якіх складае сем дзён. Гэты прамежак атрымаў назву – тыдзень (русск. – неделя, царкоўнаславянскае – седмица).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У старажытным Вавілоне за кожным днём тыдня была замацавана планета-ахоўніца. За першым днём сямідзённага тыдня – сённяшняй суботай (ёсць звесткі пра тое, што ў старажытным Вавілоне тыдзень пачынаўся менавіта з суботы) – замацавалі самую далёкую з планет – Сатурн, за другім днём, які потым назавуць нядзеляй, – Сонца, за панядзелкам – Месяц (Луну), за аўторкам – Марс, за серадой – Меркурый, за чацвяргом – Юпіцер, за пятніцай – Венеру.

Сямідзённы тыдзень старажытнага Вавілона як адзінку вымярэння часу спачатку прынялі старажытныя іудзеі, пазней – грэкі і рымляне. З цягам часу яе прынялі Заходняя Еўропа і арабскі Усход. У італьянскай і іспанскай мовах першыя пяць дзён тыдня (з панядзелка па пятніцу) і сёння захавалі назвы планет, у англійскай мове толькі ў дачыненні да суботы – saturday – дзень Сатурна, нядзелі – sunday – дзень Сонца і панядзелка – monday – дзень Месяца (Луны), у нямецкай мове Sonntag (дзень Сонца) – нядзеля і Montag (дзень Луны-Месяца) – панядзелак.

Сатурн – гэта рымскі Бог, які адказваў за час, таму можна дапусціць, што і ў старажытным Вавілоне першы дзень першага дня тыдня назвалі ў гонар планеты Сатурн. Старажытныя вавілоняне прыдумалі і другую назву гэтаму дню – субота. «Дзень Сатурна яны лічылі нешчаслівым; у гэты дзень загадвалася не займацца ніякай працай, і сам ён атрымаў назву “шабат” – пакой» [1]. Характарыстыка першага дня вавілонскага тыдня (суботы) вельмі блізка нагадвае характарыстыку першага дня славянскага тыдня – панядзелка. Пазней назву “сабат” прынялі старажытныя іудзеі, арабы, славяне і іншыя народы. Такім чынам, можна адзначыць, што старажытны вавілонскі тыдзень пачынаўся з суботы.

У 988 г. князь Уладзімір прымае святое хрышчэнне і абвяшчае, што з гэтага часу Старажытная Русь будзе праваслаўнай. Разам з новай рэлігіяй прыйшоў і новы каляндар: прымаецца візантыйская эра летазлічэння, г.зн. “ад стварэння свету” (5508 г. да н.э.), уводзіцца юліянскі каляндар, але пачаткам новага года па традыцыі лічыцца 1 сакавіка. Пазней гісторыкі назавуць гэты час старажытнарускай эрай, якая праіснавала да 1700 года.

Трэба адзначыць, што звестак пра тое, якімі адзінкамі для вылічэння часу карысталіся нашы продкі, даволі мала. Ёсць меркаванні, што старажытныя славяне карысталіся месяцова-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сонечным календаром. Гэта сведчыць аб тым, што яны добра ведалі пра фазы месяца і рух сонца па небасхіле.

Можна дапусціць, што пра сямідзённы тыдзень славяне даведаліся з прыходам хрысціянства і з прыняццем праваслаўнага календара. Менавіта аб гэтым сцвярджае вядомы расійскі даследчык С.М.Талстая: «Меркаванні аб існаванні “аўтахтоннага” славянскага тыдня не маюць дастатковых падстаў; тыднёваму адліку часу ў славян папярэднічаў адлік часу па фазах Месяца, які захаваў сваё значэнне ў асобных мясцовых традыцыях да нашых дзён» [2].

Пра тое, што славяне мелі свой тыдзень, сведчаць некаторыя факты. Напрыклад, калі амаль што ўсе еўрапейскія дзяржавы адна за адной прымалі тыдзень старажытнага Вавілона і захавалі ў назвах дзён тыдня назвы старажытнарымскіх багоў, то старажытныя славяне прытрымліваліся зусім іншай традыцыі. Іх назвы дзён мелі парадкавы нумар, але не да сямі, а толькі да пяці, што, безумоўна, можа сведчыць пра старажытны пяцідзённы тыдзень: аўторак, трэцейнік (старажытная назва серады ў старaславянскай мове) [3], чацвер, пятніца. Цікава, але назва трэцяга дня, як раз адпавядала сярэдзіне паміж чатырма днямі: панядзелак, аўторак, серада, чацвер, пятніца. Складаней з панядзелкам. На жаль, не захавалася яго старажытная назва, таму можна дапусціць, што першы дзень тыдня меў у сваім складзе корань “адзін”.

Старажытныя славяне стварылі свой пантэон багоў, ім не трэба было запазычваць тое, што ў іх ужо было на працягу многіх стагоддзяў. Богам неба, маланкі, навальніцы яны лічылі Перуна, што адпавядала рымскаму богу Меркурыю; богам святла і цяпла, што падае сонца, лічылі Хорса (або Дажбога). Ладай звалі ахоўніцу кахання і шлюбу. Яе якасці даволі блізкія да якасцей рымскай багіні Венеры. Цікава, але ў старажытных славян не было бога, які быў ахоўнікам войнаў, што даказвала міралюбівы характар гэтага народа, таму ім не патрэбен быў рымскі бог вайны Марс. Значна пазней гэтую функцыю на сябе прыняў бог Пярун. Таму не трэба шукаць назвы планет у назвах дзён тыдня старажытных славян.

Калі ж паглядзець на назвы двух апошніх дзён тыдня – субота і нядзеля, то мы адразу ж заўважым, што яны выпадаюць з правіла называць дзень парадкавым нумарам. У іх назвах прыхаваны зусім іншыя характарыстыкі. Гісторыя фарміравання іудзейскай, а затым і хрысціянскай традыцый сведчыць пра тое, што старажытныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

іудзеі першы дзень вавілонскага тыдня – суботу – зрабілі апошнім днём сямідзённага тыдня, пакінулі назву, прысвяцілі Богу і забаранілі ў гэты дзень працаваць. Дакладна слова “сабат” (шабаш) азначае спакой і адпачынак.

Далей на працэс фарміравання структуры тыднёвага злічэння аказалі ўплыў падзеі, звязаныя з жыццём і смерцю Ісуса Хрыста. Менавіта той дзень, калі ён пасля ўкрыжавання і смерці ўваскрэс, назвалі ўваскрэсеннем (воскресеньем) і зрабілі яго апошнім, сёмым днём тыдня. У ІІ ст. н. э. рымскі імператар Адрыян забараніў ісцінным хрысціянам святкавать старажытную іудзейскую суботу і сваім указам перанёс дзень адпачынку на наступны дзень – дзень Сонца. У 321 г. рымскі імператар Канстанцін прыняў указ, згодна якому гэты дзень стаў дзяржаўным святам. Царква таксама прапанавала ўшаноўваць сёмы дзень тыдня ў гонар Збавіцеля, рэкамендавалася ў гэты дзень не працаваць, прыгожа апранутымі збірацца ў храмах, каб удзельнічаць у царкоўных малебнах.

Невыпадкова гэты дзень у народнай традыцыі славяне “ахрысцілі” як дзень “недлядзела” – нядзеля. Першы дзень славянскага тыдня, які быццам бы згубіў сваё старажытнае імя, стаў звацца днём пасля нядзелі – панядзелкам (пасля-нядзелак).

Цікавы той факт, што мусульманскія народы, якія таксама прынялі сямідзённы тыдзень, лічаць сёмым – непрацоўным – днём тыдня пятніцу і ўшаноўваюць гэты дзень у гонар нараджэння прарока Мухамеда.

Сярод гісторыкаў культуры існуюць розныя погляды на пытанне аб пачатку адліку дзён славянскага тыдня. У адным выпадку панядзелак лічыцца першым днём, таму што следам ідзе аўторак (рус. *вторник* – второй) – другі дзень. З другога боку, панядзелак небеспадстаўна можа ўспрымацца другім днём тыдня, першым пасля папярэдняга дня – нядзелі.

Адзначым і тое, што ў царкоўна-хрысціянскім календары працяглыя па часе святы таксама пачынаюцца з нядзелі, напрыклад Вялікдзень. Пасля Светлага Хрыстова Уваскрэсення парадак дзён на сямітыднёвы перыяд “парушаецца” – тыдзень будзе пачынацца з нядзелі і заканчвацца ў суботу. Такі адлік будзе ісці да сёмага тыдня, які пачнецца ў нядзелю і скончыцца ў нядзелю святкаваннем Тройцы.

У народнай традыцыі адлік дзён тыдня з нядзелі можна знайсці ў замовах на добры або вешчы сон: “*Нядзеля з панядзелачкам, вавторак з серадой, чацверц з пятніцаю, а субота адна, як малада.*

*Ночка цёмна, зорка ясна, сон благачасцівы…”* [4]. На Палессі казалі так: *“Спаць ложыцца нідзіля з понідiлком, уторок с серадою, четвер с пятніцей, а субота – едініца: што мені прысніцца”* [5]. У замове, якую чыталі, каб пазбавіцца ад пацукоў, зноў знаходзім сведчанне таго, што калісьці тыдзень заканчваўся ў суботу: *“Помолюсь Господу Богу и всем Святым. Господи милосердный, помоги мне с сего дня и до святой субботы...”* [6].

Акрамя гэтага, вызначаючы характарыстыку дзён тыдня, паўднёвыя і заходнія славяне даволі часта сцвярджалі, што субота – апошні дзень тыдня: “У панядзелак або чацвер пачынаецца сяўба, аўторак – нешчаслівы дзень, серада і пятніца – посныя, а субота – апошні дзень тыдня, таму ў гэтыя дні нельга пачынаць сяўбу”; “Карпацкія ўкраінцы, збіраючыся ў дарогу, пазбягалі як першага (панядзелка), так і апошняга дня тыдня – суботы” [7].

Па некаторых звестках назвы дзён ужо “ахрысціянізаванага” тыдня прыйшлі ў Старажытную Русь з Балгарыі, менавіта гэтая краіна вылучалася ў тыя старажытныя часы высокім узроўнем культуры. Акрамя Старажытнай Русі ўсе славянскія краіны прынялі назвы гэтых тыдняў і карыстаюцца імі і ў наш час.

| Балгарскія | Беларускія | Рускія | Украінскія | Польскія | Чэшскія |
|---|---|---|---|---|---|
| Понеделник | Панядзелак | Понедельник | Понеділок | Poniedzialek | Pondeiek |
| Вторник | Аўторак | Вторник | Вівторок | Wtorek | Uterek |
| Сряда | Серада | Среда | Середа | Sroda | Streda |
| Четвъртък | Чацвер | Четверг | Четвер | Czwartek | Ctvrtek |
| Петък | Пятніца | Пятница | П'ятниця | Piatek | Patek |
| Събота | Субота | Суббота | Субота | Sobota | Sobota |
| Неделя | Нядзеля | Воскресенье | Неділя | Niedziela | Nedele |

Не цяжка заўважыць, што ў рускай мове назва сёмага дня тыдня выпадае з агульных славянскіх назваў і завецца не нядзеляй, а воскресеньем. Справа ў тым, што пасля прыняцця Старажытнай Руссю хрысціянства “воскресеньем” называлі толькі адзін дзень года – дзень святкавання Пасхі. І толькі з XVI ст. у гонар уваскрэсення Ісуса Хрыста, рускія пачалі называць сёмы дзень тыдня “воскресеньем”, а слова “неделя” замацавалася за ўсім

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тыднем і замяніла сабой царкоўную назву “сядміца”. Між іншым, у царкоўным календары тыдзень і сёння называецца сядміца.

---

1. *Климишин, И.А.* Календарь и хронология. – 2-е изд., перараб. и доп. / И.А. Климишин. – М.: Наука, 1985. – С. 42.

2. *Славянские* древности: этнолингв. слов.: в 5 т. / под общ. ред. Н.И. Толстого. – М.: Междунар. отношения, 1999. Т. 2: Д – К (Крошки). – С. 95.

3. *Климишин, И.А.* Календарь и хронология / И.А. Климишин – С. 44.

4. *Замовы* / уклад. сістэм. тэкстаў, уступ, арт. і камент. Г.А. Барташэвіч. – Мн.: Навука і тэхніка, 1992. – С. 367.

5. *Славянские* древности.: этнолингв. слов.: в 5 т. / под общ. ред. Н.И. Толстого. – М.: Междунар. отношения, 1999.– Т. 2: Д – К (Крошки).– С. 95.

6. *Степанова, Н.И.* Большая книга магии / Н.И. Степанова. – М.: РИПОЛ КЛАССИК, 1999. – С. 190.

7. *Славянские* древности.: этнолингв. слов.: в 5 т. / под общ. ред. Н.И. Толстого. – М.: Междунар. отношения, 1999. Т. 2: Д – К (Крошки).– С. 97.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ